Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

Беларускі Звон

Радыкальная тыднёвая часапісь.

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі Вільня, Ліпоўка № 8.

Прыймо інтэрэсантаў ад 10 да 2 г. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

ПАДПІСКА з дастаўкай да хаты: на 1 год — 6 зл., за паўгоду — 3 зл., за 3 месяцы — 2 зл., за 1 месяц — 75 гр.

Год I. | Вільня, 30 Лістапада 1931 г. | № 23

„Старыя“ і „маладыя“.

Ужо больш за 25 гадоў ідзе інтэнсыўна беларускі адраджэнскі рух.

25 гадоў — гэта-ж жыцьцё цэлага пакаленьня. Тая моладзь, якая *тады* была маладой і з усей энэргіяй маладых душ аддавалася цалком, без астачы вялікай і сьвятой справе Адраджэньня свайго народу, — *цяпер ужо старыя.* Яны адслужылі свой век на грамадзкай працы; яны ўзгадавалі новае пакаленьне сьведамых беларусаў—інтэлігентаў, сялян, работнікаў, каторыя мусяць заняць іх месца; і яны, „старыя“, ждуць—не даждуцца, каб маладая зьмена прыйшла і станула да працы.

Аднак, неяк ня відаць гэтае новае зьмены працаўнікоў пры рабоце. Паглядзеце на ўсе нашыя грамадзкія арганізацыі і установы, і вы ўгледзіце, што ўсюды на кіраўнічых становішчах ужо многа год астаюцца ўсё тыя-ж людзі — прадстаўнікі старога пакаленьня. І толькі зрэдка, дзе-не-дзе, сустракаюцца запраўды маладыя працаўнікі, якія выяўляюць ахвоту да працы.

Калі пачынаеш гутарыць аб гэтым з „маладымі“, дык часта пачуеш адказ: „Ды як-жа нам спіхаць нашых старых вучыцялёў? Мы-б хацелі працаваць, — але-ж няма куды прыткнуцца...“ І лятуцяць аб тварэньні *нанова* таго, што створана „старымі“, — але далей лятункаў ня йдуць. Дый ня могуць пайсьці: як ні сумны стан нашых грамадзкіх арганізацыяў і ўстаноў, стварэньне іх вымагала затраты вялізарнай энэргіі, вялізарнага высілку ў працягу цэлых дзесяцігодзьдзяў, — а вось „маладым“ здаецца, што гэта так проста й так лёгка тварыць новыя, здольныя да жыцьця арганізацыі!

Гэтае становішча „маладых“ цалком абаперта на нейкім непаразуменьні. Бо-ж „старыя“ толькі затым і трымаюць у сваіх руках здаўна існуючыя арганізацыі і ўстановы, што „маладыя“ дагэтуль ня станулі поплеч з імі да працы, *не ўвайшлі ў работу і не маглі дзеля гэтага пераняць у свае рукі кіраўніцтва тым, вонках чаго стаяць.*

Гэтае зьявішча можна сцьвярдзіць усюды, — ці то будзе нейкая прасьветная арганізацыя (Навуковае Т-ва, Інстытут Гаспадаркі і Культуры), ці эканамічная (Коопэратыўны Банк), ці якая іншая. Мо‘ найбольш „амаладзілася“ наша віленская гімназія, дзе сёлета працуе некалькі маладых вучыцялёў; у іншых установах гэтага ня відаць.

Нам здаецца, што пара ўжо „маладым“ на дзеле даказаць, што яны дарасьлі да адказнае працы на грамадзкай ніве, — працы не дэструкцыйнае, якая гэтак лёгкая, што кожын анальфабэт можа яе рабіць, — але працы запраўды *творчае, конструкцыйнае.* Але дзеля гэтага яны — „маладыя“ — і павінны ўваходзіць у створаныя папярэднім пакаленьнем арганізацыі ды ўстановы і *ў працэсе супольнае працы пераймаць гэтыя арганізацыі і ўстановы ў свае рукі.* Без мамэнту такога *стыку* ня было-б цягласьці ў працы, і новыя людзі без карысьці марнавалі-бы свае сілы й энэргію часта на тое, што ўжо здабыта практыкай іх папярэднікаў.

Пара — вялікая пара прысьпешыць гэты мамэнт стыку маладога пакаленьня з старым, бо-ж ад яго — і толькі ад яго залежыць пераняцьце „маладымі“ працы й адказнасьці за яе. А „старыя“ бясспрэчна толькі будуць вітаць гэты мамэнт, дзеля якога працавалі ў працягу дзесяткоў гадоў.

Беларускія сяляне, рыхтуйцеся да сьпісу насяленьня!

Напамінаем яшчэ раз нашым чытачом аб тым, што 9 сьнежня на ўсім абшары Польскай Рэспублікі мае адбыцца агульны сьпіс насяленьня.

Аб значэньні сьпісу насяленьня, які насамперш дасьць усебаковую характарыстыку галоўнага багацьця дзяржавы—таго чалавечага запасу, які творыць усе іншыя багацьці, творыць усё жыцьцё краю, — мы ўжо казалі падрабязна ў папярэднім нумары. Напомнім толькі, што гэты другі для ўсей Польшчы перапіс зьяўляецца для большай часткі нашага краю—першым, а таму мае для нас зусім асаблівае значэньне. Напомнім і тое, што, характэрызуючы ўсебакова насяленьне, сьпіс мае высьветліць паміж іншым дакладна і нацыянальны склад дзяржавы, а ў частцы, што для нас асабліва важна, — мае даць сьпіслую лічбу беларусоў у Польшчы.

Якое вялікае значэньне мае гэтая лічба ў цэлым разе пытаньняў першараднай для нас важнасьці — ў галіне нацыянальна-палітычнай, гаспадарчай, культурна-асьветнай і т. д.— зразумела кожнаму. Скажам толькі, што ваяўнічы нацыяналізм, які мае ў Польшчы вялізарную сілу, усьцяж імкнецца давесьці, быццам на ўсім прасторы так-званых усходніх „крэсаў“ беларусы ня маюць большасьці... Падставы да такога яўна недарэчнага цьверджаньня дае выразна сфальшаваны, як прызнана самой паважнай польскай публіцыстыкай, першы сьпіс насяленьня 1921 г.

У часе сьпісу, які распачнецца ад 8 гадзіны раніцы і скончыцца ў той-жа дзень адначасна па ўсей Польшчы, кожны грамадзянін, кожная грамадзянка мае адказаць на цэлы рад простых і зразумелых для кожнага пытаньняў: датычна полу (мужчына ці жанчына), веравызнаньня (праваслаўны ці каталік), ступені ўзгадаваньня (якую школу скончыў), фаху, спосабу заробку і інш. Пытаньня аб нацыянальнасьці анкета сьпісу выразна ня ставіць, але ставіць пытаньне аб **роднай мове** кожнага жыхара.

Памятаючы, што для беларускай справы ў Польшчы наагул, для абароны правоў беларускага народу ў-ва ўсіх галінах нашага жыцьця — асабліва ж у найактуальнейшай для нас справе культурна-асьветнай і школьнай — гэтае пытаньне аб роднай мове мае найвялікшае значэньне, трэба на гэтае пытаньне зьвярнуць кожнаму беларусу асаблівую ўвагу.

Трэба, каб кожны беларус і кожная беларуска ясна і выразна заявілі, што родная мова іх (а калі ёсьць дзеці, дык і іх дзяцей) ёсьць мова беларуская. Трэба, каб, адказаўшы на гэтае пытаньне, кожны грамадзянін сам праверыў, ці добра і дакладна запісаны гэты яго адказ камісарам перапішчыкам. Бо-ж трэба памятаць, што наагул могуць сярод іх знайсьціся адзінкі нясумленныя; а магчыма, што будзе шмат такіх адзінак, якія будуць старацца выкарыстаць гэты сьпіс насяленьня ў сваіх нацыянальных мэтах. Трэба ведаць, што такімі сьпішчыкамі будуць у нас пераважна, калі ня выключна, польскія ўрадоўцы і польскія грамадзкія дзеячы. Некаторыя з іх могуць, навет не здаючы сабе справы з недазволенасьці наймення навет націску на сьведамасьць і волю адказчыка, „памагаць“ яму ў яго адказе на пытаньне аб мове, каб можна было пасьля — пры падлічэньні і апрацоўцы адказаў — зрабіць яго „паляком“... Дык, карыстаючыся з дапамогі перапішчыкаў у іншых пытаньнях, на запытаньне аб роднай мове трэба каротка, выразна і рашуча цьвярдзіць адно толькі слова: БЕЛАРУСКАЯ, ня слухаючы ніякіх „радаў“, „высьвятленьняў“ ці надшэптаў.

Добра было-б, каб у кожнай хаце — ў часе сьпісаваньня — была асоба граматная па-польску, якая-б пільна сачыла за тым, каб усе адказы датычна мовы былі дакладна і выразна запісаны згодна з праўдай.

Грамадзяне Беларусы! Зьбірайцеся адзін да аднаго на нараду, пагутарыце, згаварыцеся адзін з адным, арганізуйце ў кожнай вёсцы такі „наглядчы“, ці „кантрольны“ сьпісавы камітэт, які ўзяў бы на сябе зараз-жа падрыхтоўку да сьпісу сваіх грамадзян, растлумачыў-бы менш сьведамым значэньне сьпісу, рассеяў бы ў палахлівых, асабліва ў жанчын, усялякі недарэчны страх перад сьпісам, а галоўным чынам высьветліў канешнасьць адказываць згодна з праўдай, а тым самым—канешнасьць і важнасьць, выразна сцьвярдзіўшы сваю родную беларускую мову, заявіць сябе беларусамі.

Японска-кітайскі канфлікт і Ліга Нацыяу.

16 лістапада пачалася другая ўжо надзвычайная сэсія рады Лігі Нацыяў — у справе зьліквідаваньня „канфлікту“, а ўзапраўднасьці — ўжо проста вайны між Японіяй і Кітаем. Кроў, асабліва-ж кроў кітайская, як значна слабейшай стараны, ліецца ракой; забітыя і раненыя, пераважна кітайцы, лічацца ўжо тысячамі, а Ліга Нацыяў усьцяж яшчэ „вядзе гутаркі“, „прымае меры“, каб „папярэдзіць разьліцьцё крыві“, каб „не дапусьціць да вайны“.

Справа ў тым, што дагэтуль цэнтральны ўрад Кітаю, разьлічаючы на Лігу, устрымліваецца ад ваенных крокаў, але Японія, не зварочваючы на Лігу ніякай увагі, б‘е кітайцаў і захоплівае вялізарныя абшары кітайскай зямлі і т. д.

Адчыняючы сэсію рады, Брыян красамоўна заявіў, што Рада будзе і надалей, як і раней, шукаць... безпартыйнага (?) вырашэньня канфлікту“. Брыян напомніў абедзьвюм старонам аб іх прырачэньні не пагаршаць палажэньня. Характэрна, што — па дамаганьню Японіі — Рада Лігі працуе пры зачыненых дзьверах (тайна), проці чаго дарэмна пратэставаў дэлегат Кітаю. Пакуль Рада „радзіць“, Японія здолела ўжо разьбіць значныя сілы кітайскага генэрала Маа, захапіць важны пункт на Усходня-Кітайскай чугунцы Цыцыкар, манілася захапіць навет напалову расейскае места Харбін, што выклікала вострыя пратэсты з з боку Радаў. Пратэсты гэтыя асабліва завастрыліся таму, што Японія пачала арганізоўваць „белых“ расейскіх эмігрантаў быццам дзеля захвату ўсяго расейскага Далёкага Усходу, а з другога боку падрыхтоўвала ўтварэньне з Манчжурыі „незалежнай дзяржавы“ — зразумела-ж — „пад рукой“ Японіі.

Чаму-ж гэта так? А вось чаму.

Усе дзяржавы добра разумеюць, што бяссільле Лігі спыніць ваенны напад аднаго яе сябры (Японіі) на другога (Кітай) страшэнна пагражае маральнай павазе Лігі. Аб гэтым зрабілі моцныя заявы дэлегаты Англіі, Нямеччыны і Польшчы. Але адразу высьветлілася на першым-жа паседжаньні Рады, што Амэрыка ня мае ахвоты далучыцца да якіх-небудзь рашучых мераў націску на Японію, якія прадбачыць § 16 статуту Лігі і інш. Гэты § прадбачыць такія меры, як разрыў дыплёматычных адносінаў, спыненьне гандлёвых стасункаў і т. д., ня кажучы ўжо аб мерах ваенных. Але вайны Японія ні з якога боку не баіцца: Амэрыка рызыкаваць сваім флётам ня будзе; Рады маюць такі „транспорт“, такі стан сваіх чугунак, што перакідаць войскаў ня могуць зусім, ня кажучы ўжо аб голадзе на ўсім прасторы СССР; Англія расхісталася, як палітычна, таксама і фінансава; Францыя за ўсялякую цану хоча ўтрымаць свае пануючае становішча ў Эўропе; рэшта дзяржаваў ня можа іосьці навет у рахунак. Што датычыць да націску гаспадарчага, дык Японія добра разумее, што ніводная з вялікіх дзяржаваў — у часе пераживанага ўсімі ім

крызісу — не адмовіцца ад гандлю з такім здаровым і карысным купцом на ўсялякія тавары, ак Японія, якая купляе цяпер асабліва многа дый плаціць, не таргуючыся, гатоўкай.

Вось чаму праца Лігі адразу пайшла вельмі туга. Сьпярша Радзе Лігі ўдалося змусіць Японію раскрыць перад Радай тыя варункі, якія Японія ставіць Кітаю, — для спыненьня вайны. Бо ж раней Японія дамагалася, каб Ліга ня ўмешвалася зусім у яе „беспасрэдныя перагаворы з Кітаем". У гэтых „варунках" Японія быццам трэбуе ад Кітаю толькі — „выкананьня заключаных дагавораў". Але дэлегат Кітаю кляўся ўсімі сьвятымі, што адны з тых „дагавораў", на якія пазываецца Японія, ніколі навет не існавалі, другія былі толькі падрыхтаваны, як праекты, японскім урадам, але ніколі ня былі прыняты ані зацьверджаны Кітаем. Японія толькі некалькі разоў прабавала накінуць Кітаю гэтыя дагаворы аружнай сілай...

Апошнія весткі кажуць, быццам Радзе Лігі Нацыяў усё-ж такі ўдалося дабіцца нейкіх рэзультатаў. На пасяджаньні 26/XI.31. Рада аднагалосна (нават галасам Японіі) прыняла праект пастановы аб вывадзе японскіх войскаў з Манчжурыі і аб назначэньні міжнароднай камісіі, якая мае быць выслана на мейсца ваенных падзеяў. Далей Рада пастанавіла выслаць тэлеграфны заклік да абодвух урадаў—японскага і кітайскага, каб устрымаліся ад усялякіх ваенных крокаў, пакуль міжнародная камісія Лігі ня зьявіцца на мейсца дый ня дасьць Радзе справаздачы.

У колах Рады кажуць ясна, што гэтыя крокі зроблены ў інтэрэсах Японіі. Справа ў тым, што ў Манчжурыю пасоўваецца ўжо 200.000-ая армія Чанг-Кай-Шэка, якая будзе змушана распачаць ужо запраўдную вайну, ад чаго, разьлічаючы на Лігу, устрымлівалася. Сілы Японіі пакуль што разоў у 10 меншыя... Такім чынам прыпыненьне ваенных крокаў дасьць Японіі час на павялічэньне сваіх сілаў. Апроч таго, пастанова Рады трэбуе ад Японіі вывесьці войскі — „у найкарацейшым часе", не азначаючы аднак-жа тэрміну сьціслага... Але ў кожным разе ёсьць надзея, што ня столькі пад націскам Лігі, сколькі пад пагрозай вайны з боку Кітаю, Японія пойдзе на зьніжэньне сваіх першапачатных „варункаў"; а з другога боку—і Кітай, баючыся рызыкаваць у баі з японскім войскам усей сваей арміяй, дый страціўшы надзею на Лігу, пойдзе на значныя ўступкі Японіі.

Такім чынам—ня столькі Ліга, як рашымасьць Кітаю даць адпор Японіі зрабіла „падставы" для мірнага паразуменьня: узяць на сябе адказнасьць за выкліканьне запраўднай вайны Японія неяк не рашылася.

Але свайго даб'ецца блізу поўнасьцяй.

Як відаць з польскай прэсы, Польшча страшэнна цікавіцца лёсам канфлікту ў Лізе, бо-ж бязкарнасьць японскага гвалтоўніка і бясільле Лігі ў гэтым канфлікце стварае вельмі благі для ўсіх іншых „прыклад". Прыклад гэты можа спакусіць Нямеччыну зрабіць — пры выгадных міжнародавых абставінах—тое-ж самае з Польшчай... Збанкрутаваўшая ў гэтым выпадку дарэшты Ліга пэўне-ж ня была-б і тут лепшай...

Перачытаўшы газэту —
перадай другому.

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Проці-жыдоўскія авантуры эндэцкіх студэнтаў.

У лістападзе ў цэлым радзе ўнівэрсытэцкіх местаў Польшчы адбыліся проці-жыдоўскія выступленьні, арганізаваныя эндэцкай студэнскай моладзьдзю.

У Вільні гэтыя беспарадкі прынялі асабліва жорсткі і агідны характар, даўшы ў выніку двух забітых—студэнта-паляка і жыда работніка, а датаго ж — шмат раненых. Каб памсьціцца за забітага ў „перастрэлцы" прыпадкова кіненым камнем студэнта-паляка, банды рознага роду цёмных асобаў, сярод якіх аднак было шмат у студэнскіх шапках, павыбівалі блізу ўсе вокны ў жыдоўскіх крамах у цэнтры места, зрабіўшы гэтым вялікія страты.

У рэзультаце — польскае „нацыянальна чуючае" грамадзянства абвясьціла байкот жыдоўскім крамам.

Вялізарны палітычны працэс.

Ужо каля месяца ў варшаўскім акружным судзе ідзе вялізарны палітычны працэс кіраўнікоў так-званага „Цэнтралеву", ці „берасьцейскіх вязьняў".

Справа ў тым, што пасьля роспуску Сойму ўлетку 1930 г.—правадыры „Цэнтралеву" ці паразуменьня левых і цэнтравых апазыцыйных партыяў Сойму — пераважна работніцкіх і сялянскіх—склікалі так званы „конгрэс абароны вольнасьці і права" ў Кракаве, які меў заманіфэставаць пратэст проці „сыстэмы дыктатуры" і роспуску Сойму і дамагацца чыстых выбараў. У часе конгрэсу, на які зьехалася — на запросіны арганізатараў— шмат дэлегатаў, было сказана даволі вострых прамоваў дый вынесена вострая рэзолюцыя, скіраваная проці ўраду, але адначасна даволі моцна крытыкаваўшая асобу Прэзыдэнта Рэспублікі —за тое, што быццам ён „ня выконывае тых сваіх абавязкаў аховы конституцыі", аб якіх кажа дадзеная ім прысяга...

Як ведама, урад вельмі жорстка расправіўся з некаторымі арганізатарамі і кіраўнікамі Цэнтралеву і склікансга імі конгрэсу. Яны былі арыштаваны, пасаджаны ў вайсковую турму, дзе іх падпарадкавалі вельмі жорсткаму ваеннаму вастрожнаму статуту, а як цьвердзяць некаторыя з іх, навет білі і абражалі...

Цяпер урад пацягнуў блізу ўсіх гэтых правадыроў цэнтра-левай апазыцыі да судовай адказнасьці. Працэсам гэтым, трэба прызнаць, урад зрабіў сабе вельмі сумліўную прыслугу... Калі ў свой час прэсе ня было дадзена магчымасьці асьвятліць перад шырокімі масамі грамадзянства ўсю справу гэтага палітычнага акту апазыцыі, дык цяпер дакладныя справаздачы з судовай салі разьвярнулі перад усім народам шырокі і яркі абраз палітычнай барацьбы паміж урадам і партыйна-арганізаваным польскім грамадзянствам... Трэба прызнаць далей, што абарона абвінавачаных дасканала арганізавала працэс ня толькі з праўнага, але і з палітычнага боку, чаго ня можна зусім сказаць пра дзяржаўных абвініцеляў... Абвіненьне наагул кампрамітуецца перад усім грамадзянствам Польшчы, навет па за межамі яе, — ня толькі з боку праўнага, але і палітычнага.

Памятная дошка марш. Пілсудскаму ў Лідчыне.

У мястэчку Ліпнішкі, Лідзкага пав., урачыста адкрыта памятная дошка ў чэсьць марш. Пілсудскага, які 37 гадоў назад выдаў тутака першыя 5 нумароў падпольнай часопісі Польскай Соцыялістычнай Партыі „Роботнік". Урачыстасьць закончылася выбарам марш. Пілсудскага пачэсным грамадзянінам мястэчка.

Праект новага адміністрацыйнага падзелу Польшчы.

Рада Міністраў разглядае цяпер новы праект зьменаў у адміністрацыйным падзеле Польшчы, які прадбачыць зьмяншэньне ваяводзтваў з 17 на 12, а таксама значнае зьмяншэньне і лічбы паветаў.

Праект новага карнага кодэксу.

Міністэрства справядлівасьці апрацавала праект новага карнага кодэксу (збору ўгалоўных законаў). Праект мае ў хуткім часе разглядацца ў парляманьце. Наваколпраекту ўжо завязалася ў прэсе гарачая палеміка.

Паміж іншым, праект значна злагоджвае кары за так званае „папярэджаньне цяжарнасьці", што выклікала проці гэтага закону рашучую барацьбу з боку каталіцкага касьцёлу; у другой галіне—для прыкладу — праект значна павялічывае грашовую адказнасьць з боку сьведкі за незьяўленьне на суд.

Новыя выбары ў Перамышльскім вокрузе.

21 лістапада адбыліся новыя выбары ў Сойм у Перамышльскім вокрузе, дзе выбары былі скасаваны пастановай Найвышэйшага Суду.

Новыя выбары далі той-жа самы падзел мандатаў, што і папярэднія: Урадавы Блёк здабыў 4 мейсцы, „Цэнтралеў" і „Ундо" (украінцы) па 1 мандаце.

Заграніцай.

Расправа з сялянамі.

З Дзісны даносяць, што ў крайскім вокрузе радавыя ўлады зрабілі крывавую расправу з цэлай вёскай Таболкі, забіўшы ды зраніўшы цяжка блізка 50 сялян — за апор пры шуканьні аружжа. 9 сялянам удалося неяк уцячы на польскі бок граніцы.

Польшча—Румынія—СССР.

Нямецкая прэса ізноў занепакоілася весткамі аб набліжаючымся падпісаньні польска-савецкага трактату аб узаемным ненападаньні.

Запраўды-ж, паміж Варшавай і Масквой ізноў узнавіліся перагаворы ў справе такога трактату — быццам пад рашучым націскам з боку новага францускага пасла ў Маскве. Францускі ўрад быццам узалежняе ад заключэньня польска-савецкага трактату падпісаньне палітычнага і гаспадарчага трактатаў з Саветамі. Нямецкая прэса з трывогай даносіць, быццам радавы ўрад ідзе ў адносінах да Польшчы цяпер на такія ўступкі, ад якіх яшчэ ў 1926 г. катэгарычна адмаўляўся. З свайго боку Польшча ня высоўвае, як пішуць, больш, як свайго варунку, нейкага супольнаг..

Хістаньні нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі ў Савецкай Беларусі.

(Даканчэньне).

Далейшым мамэнтам у „абмылковасьці" ранейшай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца *справа будаўніцтва культуры.* У „Азбуцы ленінізму", там, дзе гаворыцца аб беларусізацыі, быў пакладзены націск на ўцягіваньне ў будаваньне беларускай кальтуры перадусім работнікаў *беларусаў.* Тут, паводле новага курсу, перадусім засьцерагаецца, што „мы будуем культуру *пролетарскую* па зьместу, а нацыянальную па форме". У чым павінен выяўляцца яе пролетарскі зьмест, аб гэтым нічога выразнага знайсьці немагчыма; затое ясна сказана, што — у процівагу ранейшай лініі ў будаваньні беларускай культуры беларускімі рабочымі — „у будаўніцтве яе прымаюць удзел *усе працоўныя бяз рожніцы нацыянальнасьці, бяз рожніцы—гавораць яны ўжо на беларускай мове, ці не гавораць, ці зьяўляецца роднай мовай для іх беларуская, ці не*". Іншымі славамі: навучаюцца беларускай мовы і маскалі, і палякі, і жыды, каб яны маглі будаваць беларускую нацыянальную культуру „пролетарскага зьместу". Тут чытач ня можа не застанавіцца над пытаньнем, як гэта маскаль, жыд ці паляк маюць будаваць беларускую культуру? Калі з гэтым згадзіцца, то трэба прыйсьці такжа да вываду, што, раз работнікі маскалі, жыды і палякі могуць памагаць будаваць беларускую культуру, дык чаму беларускі работнік не павінен памагчы будаваць маскоўскую, жыдоўскую і польскую пролетарскую культуру? Як коопэрацыя, дык коопэрацыя. Але далей на тэйжа 7-ай старонцы „Нацыянальнай політыкі ком. партыі" рэдактары Гаруновіч і Будзінскі, заблутаўшыся ў туманнай фразэолёгіі, неспадзявана прыходзяць да іншага вываду: „усіх рабочых мы ўзбройваем (беларусізацыяй) нароўні з рабочымі беларускай нацыянальнасьці тэй зброяй, без якой пролетарыят БССР ня можа пасьпяхова кіраваць асноўнымі масамі сялянства БССР у барацьбе супраць кулака і нэпмана ды іх ідэолёгаў—нацыянал-дэмократычнай буржуазнай інтэлігенцыі—у барацьбе за соцыялізм". Гэтым сказана ясна, што беларусізацыя патрэбна савецкай уладзе, *каб мець уплывы на сялянства,* да якога ўсё-ж такі ня можна гаварыць парасейску, бо яно гэтага ня хоча. Іншымі словамі: гавораць камуністы да сялян у мове беларускай, бо такім чынам іх лягчэй комунізаваць, і—толькі.

Пасьля гэтага ўсяго няма сумліву, што праграмовыя гутаркі комуністаў аб будаваньні якой-бы то ні было беларускай культуры зьяўляюцца *пустымі фразамі..*

У далейшых разважаньнях упомненая брашура выступае проці цьверджаньня ў „Азбуцы ленінізму", што расейскі вялікадзяржаўны шовінізм у Савецкай Беларусі падтрымлівае сярод працоўных мас раней прыгнечаных нацыяў недавер да комунізму і дае повад для антысавецкай агітацыі нацыяналістаў, але, як гэта ні дзіўна, адначасна прызнае, што „перажыткі расейскага вялікадзяржаўнага шовінізму ствараюць умовы для ўзьнікненьня гэтага недаверу".—„Нельга таксама гаварыць,—пішацца далей,—што вялікадзяржаўны шовінізм дае повад для антысавецкай агітацыі буржуазных нацыяналістаў. Вялікадзяржаўны расейскі шовінізм жывіць антысавецкую агітацыю буржуазных нацыяналістаў і робіць яе больш уплывовай, больш дзейнай у адносінах да шырокіх мас раней прыгнечаных народаў, — вось у чым яго шкоднасьць. Але са зьнішчэньнем вялікадзяржаўнага шовінізму ня згінуць повады антысавецкай агітацыі буржуазных нацыяналістаў".

З прыведзенага ясна, што камуністы ў гэтым пытаньні, прызнаючы шкоднасьць расейскага шовінізму, аднак усёж стараюцца зьмягчыць значэньне гэтай шкоднасьці, бяручы ў пэўнай меры ў абарону гэты шовінізм. Практыка найлепш паказвае справядлівасьць гэткага вываду, бо, ня гледзячы на расейскія шовіністычныя тэндэнцыі некатарых адказных савецкіх урадоўцаў у Савецкай Беларусі, мы ня чулі, каб яны цярпелі якія-колечы перасьледаваньні. Не баяцца гэтыя шчасьліўцы ніякіх няпрыемнасьцяў, бо чуюць за сабой сільнага пратэктара — маскоўскі Крэмль, які іх прысылае ў Менск, як мужоў даверу.

Вось тыя найбольш асноўныя рожніцы ў палітычным курсе савецкае нацыянальнае палітыкі даўнейшае і цяперашняе. На першы пагляд яны выдаюцца мала істотнымі, аднак у практыцы яны ў вялікай меры важаць на лёсе нацыянальнага жыцьця Савецкае Беларусі. Праўда, новы палітычны курс да Беларусаў перш, чым выявіўся ў друку, быў праводжаны па загаду з Масквы на дзеле; але ўсё ж гэтыя рожніцы адбіваюць тэндэнцыі савецкае ўлады і маюць вялікае значэньне да сягоньняшняга дня пры паралізаваньні беларускага нацыянальнага жыцьця на той бок граніцы.

Як ведама, найбольш характэрным мамэнтам савецкай палітыкі агулам ёсьць *нясталасьць.* На-

БЕЛАРУСЫ!

У дзень агульнага сьпісу насяленьня прыпільнуйце, каб вам упісалі беларускую мовц, як роднцю.

трактату з балтыцкімі дзяржавамі (пасьля няўдачы яе балтыцкае палітыкі—гл. рэзкі канфлікт з Латвіяй). За тое — з усей сілай высоўвае варунак—адначаснага заключэньня саветамі такога-ж „трактату аб ненападаньні“ з Румыніяй. У гэтай справе, як даносіць румынская прэса, вёў спэцыяльную нараду польскі пасол у Букарэшце з румынскім міністрам Гікай. Польскі ўрад мае надзею, што цяпер—у час надзвычайна важных для СССР падзеяў на далёкім Усходзе — савецкі ўрад будзе больш згаворчывым на Захадзе...

Вольны кангрэс у справе разбраеньня.

Як ведама, на пачатку будучага году мае сабрацца агульная міжнародавая конфэрэнцыя ў справе разбраеньня. Падрыхтаваньнем яе,—праўду сказаць, вельмі павольным і няўдалым,—ужо некалькі гадоў займаецца Ліга Нацыяў. — Няма навет ніякай пэўнасьці, што конфэрэнцыя зробіць нешта позытыўнае, дый навет магчыма, што будзе адложана надалей, бо-ж галоўныя супярэчнасьці паміж дзяржавамі ў справах разбраеньня дагэтуль не залагоджаны. Дык асаблівую ўвагу зьвяртае распачаўшы працу ў Парыжу 26 лістап., так сказаць, прыватны кангрэс барацьбітаў за разбраеньне розных дзяржаў і народаў.

Старшынёй кангрэсу, сабраўшага 1043 дэлегатаў, ёсьць ведамы ангельскі пацыфіст лёрд Сэсіль, які ў сваёй прамове заявіў, што мэта кангрэсу—маральнае падрыхтаваньне разбраеньня—дзеля будучае конфэрэнцыі. Сярод сяброў конгрэсу, здаецца, пераважае так званая „ангельская тэза“, якая трэбуе насамперш разбраеньня, бо збраеньні самі сабой няўхільна вядуць да вайны, якая можа зьніштожыць усю цывілізацыю сьвету. Як ведама, з гэтай „ангельскай тэзай“ вядзе зацятую барацьбу „тэза французская“, якая даводзіць—наадварот — неабходнасьць утрыманьня збраеньняў, пакуль ня будзе загарантавана загрожаным дзяржавам нятыкальнасьць умацаваньнем маральнага разбраеньня і палітычных трактатаў.

Ізноў — няўдалая спроба фашыстаўскага перавароту ў Нямеччыне.

Сэнсацыя дня ў Нямеччыне — змова „гітлераўцаў“ (нямецкіх фашыстаў). Гітлераўцы рыхтавалі захват улады — сьпярша ў Гэсэне, а пасьля ўва ўсей Нямеччыне. Пераварот мелі зрабіць так званыя „штурмавыя колёны“ гітлераўцаў, перагляд якіх рабіўся ў апошні час у розных местах Нямеччыны. Замах выкрыўся, дзякуючы здрадзе аднаго з іх выдатных павадыроў, які пераслаў важныя дакумэнты пракурору. Зробленыя зараз-жа вобыскі і арышты раскрылі разгалінёную на ўсю Нямеччыну арганізацыю замаху. Паміж дакумэнтамі ёсьць характэрная „адозва“ да насяленьня ад імя меўшага ўжо здабыць перамогу новага „рэвалюцыйнага“ ўраду. Адозва трэбуе ад насяленьня поўнай пакорнасьці камандзірам „штурмавых атрадаў“, якія ўпаўнаважваюцца за ўсялякі апор—караць сьмерцяй... Усе спажывецкія прадукты ў краі падлягаюць канфіскаваньню, якое маюць без усякага апору і кантролю даканаць тыя-ж „штурмавыя колёны“... Тыя ж „колёны“ адбяруць усё аружжа ад насяленьня. Дамы і землі адбіраюцца ад уласьнікаў і аддаюцца пад прымусовы загад тых-жа „колённаў“. Адначасна мела быць уведзена прымусовая павіннасьць працы (прыгон), якой мелі падлягаць усе грамадзяне — бяз розьніцы полу, апроч толькі жыдоў, якія абвяшчаліся... пазбаўленымі аховы законаў!.. Незабыты, зразумела, у „адозьве“ і ваенна-палявыя суды, судзьзямі ў якіх мелі быць тыя ж самыя камандзіры „штурмавых дружынаў“...

Цікаўна, што адначасна з падрыхтоўкай такога перавароту гітлераўскія правадыры вялі перагаворы аб уваходзе ў склад урадавай большасьці — з найбольш уплывовымі чыньнікамі нямецкай палітыкі, якія ўжо ў апошні час навет значна прыхіліліся да супрацоўніцтва з гэтымі замахоўцамі. Гітлераўскіх правадыроў прымаў сам прэзыдэнт Гіндэнбург, з імі, як з палітычным чыньнікам, гутарыў прэм'ер, з імі паразумявалася дэцыдуючая партыя „цэнтру“, з імі мела быццам ужо хутка утварыцца ўрадавая большасьць—коштам уплываў соцыялістаў.

цыянальнае пытаньне—гэта толькі адна з праяваў нясталасьці іх палітыкі. Калі нацыянальнае пытаньне на Беларусі бальшавікі ўвялі ў кнігу „Азбука ленінізму“, то магло здавацца, што гэтае пытаньне вырашана там у закончанай форме і сталася недатыкальным канонам. Але не прайшло шмат часу, як усё гэта аказалася „неправільным“ і „контррэволюцыйным“, ня гледзячы на загалоўленьне гэтых канонаў аўторытэтным імем Леніна.

Адным з найбольш падставовых і яркіх прыкладаў бясспыннага хістаньня савецкай нацыянальнай палітыкі ёсьць словы Сталіна на зьезьдзе УсеКП(б): „Трэба—казаў ён — памятаць, што, апрача права народаў на самавызначэньне, ёсьць яшчэ права рабочае клясы на ўзмацненьне сваей улады, і *гэтаму апошняму праву падпарадкавана права на самавызначэньне*“. Так казаў Сталін на XII зьезьдзе Саветаў; а дэклярацыя правоў народаў б. расейскай імпэрыі, абвешчаная бальшавікамі пасьля ўпадку Керэнскага і падпісаная самім Леніным, ставіць такія асноўныя палажэньні:

I. Роўнасьць і сувэрэннасьць народаў Расеі.

II. Права на іх вольнае самавызначэньне аж да адлучэньня і ўтварэньня самастойнае дзяржавы, — і т. д.

Жыцьцё зласьліва закпіла з тых, хто гэтаму паверыў, і яшчэ ня раз расчаруе наіўных, якія думаюць, што савецкая нацыянальная палітыка не прынясе ў будучыні новых неспадзяванак, мо' йшчэ больш некарысных для нацыянальнай ідэі.

Эмская.

Загранічная дыскусія ў францускім парляманьце.

У Францускім парляманьце прэм'ер Ляваль—замест хворага (?) Брыяна—даў адказ на інтэрпэляцыі ў справе загранічнай палітыкі. Ляваль даў агляд усей загранічнай палітыкі Францыі, падкрэсьлі ўпаразуменьне з Амэрыкай і стрымана крытыкаваў фінансавую гаспадарку Нямеччыны, якая, выдаючы вялізарныя грошы на розныя няпершай патрэбы рэчы, ня хоча плаціць ваенных адшкадаваньняў. Гэта, а таксама імкненьне Нямеччыны да перагляду трактатаў — перашкаджае адбудове маральнага і фінансавага даверра паміж дзяржавамі, што галоўным чынам зацягвае агульны крызіс. Але Францыя шчыра імкнецца — „замяніць нямецка-францускую трагэдыю“ „француска-нямецкім супрацоўніцтвам“. У канцы, ня гледзячы на опозыцыю соцыялістаў і радыкалаў, парлямант —325 галасамі проці 150—выразіў даверра ўраду.

У канцы ведамы прыяцель Саветаў пасол дэ Монзі выразіў пажаданьне, каб 5-летнія перагаворы з СССР урэшце дайшлі да скутку. На гэта мін. гандлю адказаў, што францускі ўрад ня дасьць Саветам ніякага крэдыту, пакуль ня будзе ўрэгулявана справа даўгоў (царскіх).

Такім чынам — 2 тыднёвая барацьба паміж опозыцыяй і ўрадам на груньце загранічнай палітыкі закончылася перамогай ураду.

Француская прэса аднак падчырківае, што тыя месцы ў прамове прэм'ера, якія казалі аб жаданьні паразуменьня з Нямеччынай, спатыкаліся большасьцяй палаты маўчаньнем, але тыя, у якіх Ляваль даводзіў неабходнасьці ўтрыманьня францускіх збраеньняў, віталіся бурнымі воплескамі...

Італьянскі міністар у Хувэра.

Пасьля візыты францускага прэм'ера Ляваля ў амэрыканскага прэзыдэнта, зараз-жа паслаў туды-ж свайго міністра загранічных спраў і Мусоліні. Мусоліні выразна вядзе на міжнародавым груньце барацьбу проці францускай дыктатуры ў Эўропе. Францыя падставай сваей палітыкі высоўвае недатыкальнасьць міжнародавых трактатаў і азначаных імі дзяржаўных граніцаў, а Мусоліні найярчэй хіба-ж з усіх былых антанцкіх дзяржаваў высоўвае канечнасьць перагляду трактату і граніц. Ляваль едучы у Амэрыку, дзе ўсё болей палітычныя і прэсавыя колы прыхіляюцца да перагляду трактатаў, заявіў, што гэтыя пытаньні цалком выключае з сваіх размоваў з Хуверам і з яго міністрамі. А Мусоліні — якраз напярэдадні выезду мін. Грандзі ў Амэрыку — сказаў вельмі вострую прамову аб неабходнасьці гэтага перагляду.

Замежная прэса (нямецкая...) падчырківае, быццам італьянскі міністар наагул сэрдэчней быў вітаны і прыманы ў Амэрыцы, чым францускі прэм'ер.

Кароткія Навіны.

— За 7 апошніх месяцаў, канчаючы кастрычнікам, бюджэтны недабор у Польшчы дайшоў да 128 м. 319 тыс. злотых.

— 23-24 лістапада адбыўся ў Варшаве зьезд ваяводаў. Праграма працы датычыла справы безрабоцьця і ўпарадкаваньня адміністрацыі.

— Газэты пішуць, што ваяводзкія камітэты ў справе безрабоцьця даюць працу значнай лічбе безработных. З іх — віленскі камітэт даў працу 350 безработным, беластоцкі — 703, Наваградзкі — 150, Палескі — 255.

— Былы віленскі віцэ-ваявода п. Кіртікліс, пасьля віцэ-ваявода лодзкі, назначаны ваяводай паморскім.

— У Конску Радамск. распачаўся працэс групы камуністаў, вінавачаных у першамайскіх выступленьнях. Паклікаңы 128 сьведкаў.

—У Варшаве ў апошнія дні выбухнула забастоўка трамваяў і аўтабусаў. Прычына забастоўкі — спрэчка паміж магістратам і мястовай радай у справе падвышкі пэнсіяў працаўнікам мескавых трамваяў. Рада пастанавіла ўвесьці ізноў прыпыненыя вышэйшыя нормы платы, а магістрат адмовіўся выканаць гэтую законную пастанову паўнамоцнага органу самаўраду.

Тады працаўнікі мескавай камунікацыі падтрымалі — і сваі інтэрэсы, і правы сталічнага самаўраду забастоўкай... Але пагрозай пазбавіць працы забастоўшчыкаў магістрат здолеў зламаць забастоўку. Большасьць працаўнікоў прыступіла да працы. Толькі невялікая група работнікаў, кіраваная ППС, здаецца, яшчэ дагэтуль бастуе.

— Новы Гішпанскі парлямант зрабіў запраўдны суд над выгнаным каралём Альфонсам. Спэцыяльная камісія дамагалася пажыцьцёвага выгнаньня былага караля з краю. Мін. справядлівасьці сам бараніў адсутнага караля, прызнаўшы аднак усе дакананыя з яго загаду нарушэньні конституцыі. Аднак, больш радыкальныя паслы выступалі з больш рэзкімі і моцнымі закідамі проці караля, даводзячы ў яго паступках факты здрады народу і дзяржавы, гвалтаў над канстытуцыяй, ламаньня права і г. д. Парлямант прыхіліўся да гэтых прамоўцаў, прызнаў был. караля цалком віноўным, прысудзіў яго да пазбаўленьня ўсялякіх правоў, пазбавіўшы ўсялякай маемасьці, і абвясьціў — „па за аховай закону“.

—10 сьнежня маюць адбыцца ў Гішпаніі выбары прэзыдэнта рэспублікі. Адзіным кандыдатам, які мае надзею на поўны пасьпех, зьяўляецца былы першы прэм'ер — рэвалюцыйнага ўраду—Алькала Заморра. Сучасны прэм'ер Азана, прыяцель Заморры, мае і надалей застацца кіраўніком ураду.

— Выбраны ў сэнат, ведамы францускі соцыяліст (патрыятычнай ахварбоўкі) Поль Бонкур, заявіў аб сваім выхадзе з партыі. Як ведама, Поль Бонкур асабліва рожніўся ад сваіх сяброў па партыі ў справах замежнай палітыкі, у частцы—адносна да Нямеччыны. У палітычных колах кажуць, што гэты крок мае аблягчыць Бонкуру, як аднаму з найвыдатнейшых дзяржаўнікаў Францыі, яго далейшую палітычную кар'еру: кандыдатуру на мін. замежных спраў—пасьля Брыяна—і на становішча прэм'ера.

— Праціўнікі фашызму ў Амэрыцы рыхтавалі прыбыўшаму сюды італьянскаму міністру рад „кацячых канцэртаў“, а навет замахаў. Аднак амэрыканскія месты, дзе зьяўляўся Грандзі, арганізавалі яго ахову сіламі некалькіх тысячаў паліцыянтаў у мундзірах ці без мундзіраў. Дык усе рыхтаваньні скончыліся нічым.

— Англійская валюта (фунт стэрлінгаў) усьцяж спадае. Апошні спадак тлумачыцца абвяшчэньнем „мараторыуму“ (прыпыненьня выплатаў) Аўстрыяй і Вэнгрыяй, якім англійскія банкі пазычылі звыш 300 мільёнаў даляраў, а таксама і пагрозай нацыяналістычнага перавароту ў Нямеччыне. Але, ведама ж, найбольш сумна падзеяла на даверра да англійскай валюты зьмяншэньне яе залатога пакрыцьця (гарантыі) — з 35.75% на 33.82%.

— Японскі дэлегат заявіў у Лізе Нацыяў, што вывад японскіх войскаў з Цыцыкару ўжо пачаўся.

Грамадзяне!

Пішыце ў сваю газэту аб жыцьці нашае вёскі і гораду.

ХРОНІКА.

— **Гмінныя курсы для камісараў па перапісі.** Ваяводзкімі камісарамі былі арганізаваны курсы для інструктароў па перапісі. Курсы гэтыя ўжо закончаны, і інструктары разьехаліся ўжо па гмінах, дзе ладзяць курсы для гмінных „камісараў", ці перапішчыкаў.

Праца камісараў—ганаровая, бясплатная, але трэба, каб, хто толькі мае магчымасьць з сьведамых і граматных беларусоў, запісываўся на гэтыя курсы.

— **7 сьмяротных прысудаў у Баранавічах.** Акружны суд на сэсіі ў Баранавічах, разглядзеўшы—у даразным парадку—справу шпіёнскай арганізацыі, якая працавала на абшары Баранавіцкага, Стаўпецкага і Нясьвіжскага пав., засудзіў усіх 7 сяброў арганізацыі на кару сьмерці на шыбеніцы. Іх усіх павесілі, бо прэзыдэнт адмовіўся памілаваць іх.

— **За ўчасьце ў КПЗБ.** Акружны суд у Наваградку засудзіў на 2 гады жыхара гм. Райчанскай Тодара Флейту—за належаньне да К.П.З.Б.

— **З жыцьця „Скарыніі".** У мінулую нядзелю, 29 лістапада, у жыцьці бел. корпарацыі „Скарынія" адбылася вялікая ўрачыстасьць: асьвячэньне яе сьцягу. Асьвячэньне адбылося ў сьв.-Духаўскай царкве пры ўчасьці чысьленай публікі. Пасьля ў памяшчэньні корпарацыі адбыўся ўрачысты конвэнт з учасьцем запрошаных гасьцей, на якім быў прачытаны рэфэрат аб заданьнях корпарацыі.

— **„Новая Варта".** Кожнае выяўленьне самадзейнасьці моладзі, паскольку яно не нарушае падставовых прынцыпаў этыкі і абаперта на ідэйных пабуджэньнях, прадстаўляе бязумоўна дадатняе зьявішча. Асабліва-ж дадатнім яно бывае тады, калі мае ў сабе творчы элемэнт. — Ведама, у галіне палітыкі самастойныя выступленьні моладзі часта могуць быць памылковымі, і да іх прыходзіцца падыходзіць з вельмі асьцярожнай ацэнкай; затое больш сьмела можа выступаць моладзь на груньце культурнае працы.

Такім дадатным зьявішчам у нашым бедным сягоньня грамадзкім жыцьці трэба лічыць выхад новае студэнцкае часопісі „Новая Варта", першы нумар якое толькі-што выйшаў у сьвет. Гэта ёсьць орган беларускае студэнцкае корпарацыі „Скарынія". Часопісь зьмяшчае цікаўны матэрыял і адзначае, паміж іншым, так няўважліва спатканы нашым грамадзянствам 25-летні юбілей існаваньня беларускае прэсы. „Новая Варта" мае на мэце ўзгадаваньне беларускага студэнцтва ў духу нашых нацыянальных ідэалаў. Ёсьць у ёй і літэратурныя творы, якія выйшлі спад пяра студэнтаў-поэтаў, сярод якіх даўно ўжо зьвярнулі на сябе агульную ўвагу такія імёны, як Бартуль, Хв. Ільяшэвіч і інш. Друкуецца „Н. В." рэформаванай лацінкай.

Пажадаем новай часопісі, каб яна добра й сумленна выпаўніла сваё заданьне.

— **„Голас Праваслаўнага Беларуса".** Выйшаў у сьвет № 1 новай часопісі, выдаванай групай праваслаўных беларусаў. Новая часопісь, як кажа ўступны артыкул, ставіць сабе задачай ухіленьне ўсіх „недахопаў і балячак" у царкоўным жыцьці, а найвялікшай з гэтых балячак лічыць—успадкаванае беларускім народам абмаскоўленьне царквы. Часопісь ставіць сабе задачай барацьбу за тое, каб „Праваслаўе на Беларусі сталася беларускім, а праз гэта родным і блізкім нашаму народу". Часопісь выражае веру ў тое, што — абапертая на тэй „адзінай запраўды пэўнай і непарушнай падставе, якой ёсьць царкоўна-арганізаваны народ", „Праваслаўная Царква на Беларусі адродзіцца, ачысьціцца і падымецца маральна, што яна прадоўжыць тую вялікую культурную місію, каторую выпаўняла ад самага пачатку хрысьціянскае эры ў гісторыі Беларусі".

У першым нумары, апроч уступнага, зьмешчаны артыкулы: „Мэты і мэтады беларусізацыі", у якім высьветляецца рэлігійная канешнасьць роднай мовы ў царкоўным жыцьці, а таксама высоўваецца неабходнасьць — у барацьбе за гэтую родную мову, за нацыянальную царкву — карыстацца чыстымі, маральнымі, адзіна дапусьцімымі ў духоўна-царкоўным будаўніцтве спосабамі, выключаючы ўсялякую ненавісьць, здольную толькі справакаваць „хатнюю, братнюю вайну ў царкве", да якой якраз і клічуць „дзеячы" ды „сьветачы Беларусі". Аднак, абодва артыкулы абвяшчаюць бязьлітасную барацьбу ўсім тым адзінкам з духавенства, якія брудзяць высокі сан сьвяшчэньніка: усім тым „пастырам, якія не пасуць, але толькі стрыгуць авечак Божых", якія „ўхіляюцца ад судовай адказнасьці за свае надужыцьці", якія „ўпорна выяўляюць ненавісьць ды пагарду да нацыянальнага вобліку" беларускага народу, катораму павінны несьці Словы Любві і Праўды Божай. Абодва артыкулы даюць трафную характэрыстыку і тых „дзеячоў", якія, згуртаваўшыся навакол „сьветача Беларусі" — Тодара Вярнікоўскага, толькі разваліваюць царкоўнае жыцьцё, абдурываючы людзей, асабліва малодшых розумам... Урэшце, трэці вялікі артыкул дае агляд ролі і значэньня беларускай Праваслаўнай Царквы ў нашай слаўнай мінуўшчыне, палажэньня яе ў сучаснасьці дый ставіць задачу яе адраджэньня, як праблему яе беларусізацыі — на груньце агульнага нацыянальнага адраджэньня народу.

Загад Віленскага Ваяводы
ў справе агульнай перапісі.

На падставе загаду Рады Міністраў з 2 верасьня г.г. 9 сьнежня адбудзецца другая сенародная перапісь.

Перапісь датычыць усіх сталых жыхароў данай мясцовасьці, хаця-б яны часова былі ў ад'езьдзе, а таксама — усіх часова пражываючых у данай мясцовасьці.

Адначасна з перапісяй насяленьня адбудзецца перапісь рамёслаў, дамоў і кватэраў.

Асобы, падлягаючыя перапісі, павінны даваць адказы на ўсе зьмешчаныя ў апросных лістах пытаньні. Па трэбаваньню камісара (перапішчыка) весткі, падаваныя ў адказах, павінны быць пацьверджаны дакумэнтамі.

Адказы павінны быць праўдзівымі і точнымі. Таму жыхары павінны прырыхтаваць згары дакумэнты: мэтрыкі і інш.

Адказы па перапісі прадстаўляюць сабой тайну статыстычных установаў, дык ня могуць быць выкарыстаны, напр., скарбовымі ўладамі для азначэньня падаткаў і т. д.

Кожны, хто з намерам ці па лёгкамыснасьці дасьць няправільныя паказаньні, або адмовіцца наагул ад адказаў, або будзе рабіць перашкоды перапісі, будзе пакараны штрафам да 5 тысяч зл., або арыштам да месяца ўключна.

Мэта перапісі—сабраць точныя і падрабязныя даныя аб колькасьці насяленьня Польшчы, яго поле, веку, роднай мове, рэлігіі, узгадаваньні і прафэсіі. Перапісь дасьць дакладныя весткі аб гаспадарчым і соцыяльным палажэньні Польскай Рэспублікі. Таму абавязак кожнага яе грамадзяніна — даць праўдзівыя і дакладныя адказы на ўсе зьмешчаныя ў анкетных лістах пытаньні. Кожны грамадзянін павінен 9 сьнежня споўніць свой абавязак, бо гэтага вымагаюць ад яго дабро дзяржавы і інтарэсы паасобных грамадзян Рэспублікі.

Паміж іншым, часопісь падае добрую вестку аб тым, быццам вышэйшая царкоўная ўлада пастанавіла ўжо прынцыпова даць беларусам Мікалаеўскую Царкву ў Вільні — дзеля стварэньня беларускага прыходу.

Проці новай часопісі, якая ставіць сабе паміж іншым мэтай і барацьбу з сучасным склада консысторыі (з 4 яе сяброў часопісь лічыць дастойным аднаго толькі а. рэктара Тучэмскага), а з другога боку барацьбу з так-зван. „Праваслаўным Камітэтам" „сьветача" — Вярнікоўскага, рыхтуецца ўжо, як мы даведаліся, цэлая „вайна". Каб скампрамітаваць праўдзівы голас чыстага беларускага грамадзянства, пушчаны ў расейскай і польскай прэсе ільжывыя весткі, быццам новая часопісь „мае бараніць сучасны склад консысторыі", ды быццам новая група мае нейкую сувязь з „прот. Кушневым". Як мы чулі, усё гэта — хлусьня, што пэўне-ж дакладна выявіць сама новая часопісь у далейшых сваіх нумарох.

— **„Сьветач Беларусі" № 3 (6), лістапад—1931.** Вышла ўжо, як відаць, пяць нумароў бруднай ды бязграматнай часопісі пад такім назовам, улічаючы-ж 2 нумары „аднадзёвак", дык аж 7,—а дагэтуль ніхто ня мог уцяміць: чаму гэта — „сьветач", дзе гэта—„сьветач", хто — гэты „сьветач"? Але вось выйшаў у сьвет № 6, „прысьвечаны 70-годзьдзю нарадзінаў і 25 годзьдзю культурна(?)-грамадзкае (?) працы" Тодара Вярнікоўскага, „старшыні Цэнтр. Бел. Праваслаўнага К-ту" (?), і—усё выкляравалася ясьней дня.—„Сьветач Беларусі"—гэта-ж і ёсьць гэты самы „дзядзька", ці „цюцік", Тодар Вярнікоўскі!.. На вокладцы часопісі якраз і зьмешчаны партрэт гэтага „дзеяча" з надпісам: „Сьветач Беларусі", дый бяз малага цэлы нумар „прысьвечаны" самаму бясстыднаму бесцэрэмоннаму, непраходна-недарэчнаму выхваляньню гэтага „старага змагара", запраўды-ж праз усё сваё жыцьцё „змагаўшагася" за ўласную кішаню. Тут яму і „слава", тут яго і „біографічны нарыс", тут аб ім і „ўспаміны"! І ўсё гэта „шчыра", з належным „талентам" і „захопленьнем" напісана, надрукована і выдана пэўне-ж за ўласныя грошы самага „сьветача" Вярнікоўскага.

Былі ў нас розныя „часопісі" — згідныя, дэфэнзыўныя, сьмярдзючыя, бязграматныя — усялякія. Але такой бязглузда-самарэклямнай, такой „асабіста-дурной", здаецца, яшчэ ня было. Стыдна толькі прадстаўніку студэнцкай моладзі Сароцы „выдзяржаўляць" свае пяро на яўна хлусьлівае рабеньне нейкага „дзеяча" ды „змагара" з звычайнага гандляра ходкім таварам дый проста— „гороховаго шута", як трафна кажуць расейцы... Аб „зьмесьце" часопісі, пэўне-ж, гаварыць ня варта.

— **„Саха".** Друкуецца і хутка выйдзе ў сьвет чарговы нумар сельска-гаспадарчага журналу „Саха".

„Новгородскій чэкіст" злуецца.

Вядомы сваімі бруднымі эляборатамі, прымазаўшыся з провакацыйнаю мэтаю да беларускага берагу ў часе Грамады, былы Ноўгарадзкі чэкіст пан Ф. Акіньчык аж пеніцца са злосьці на грам. Луцкевіча, Астроўскага і Трэпку. Утварыўшы супалку з такімі-ж як сам крымінальнымі тыпамі, на днях выдаў яшчэ адну аднадзёўку „Слова Няпраўды" (21. XI. г. г.), дзе бядуе, што паважныя „польскія колы", якім, што праўда, ён таксама закідае „масонства", сябруюць з Луцкевічам і Астроўскім, а ня з ім—Акіньчыкам.

Ці-ж п. Акіньчык яшчэ не зразумеў таго, што чэсныя людзі заўсёды старояцца брудных і здэморалізаваных тыпаў, а асабліва чэкістаў, шпікоў? Апошнімі часта так ці іначай „адпаведныя" ўстановы карыстаюцца, але рукі ім не падаюць і далей пярэдняй ня пускаюць.

Выпусканыя аднаднёўкі—родныя сёстры розных „Абухаў" і „Проч з ліхазельлем"—паказваюць толькі і выключна маральнае аблічча тых, хто іх піша і выдае—гэта іх грамадзкі пашпарт. Беларускае грамадзянства ўжо шмат бачыла такіх брудных шкумацін і, зразумела, заўсёды пераходзіць пад імі да парадку дня, выкідваючы па-за грамадзкае жыцьцё толькі тых, хто іх творыць, ачышчаючыся гэтым самым ад усякіх маральна-скалечаных адзінак.

Рэдактар-выдавец: М. СІНЯУСКІ.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая вул. 22